***Прыметнік*** *(праверачная работа, 6 клас)* I варыянт

*1.Адзначце прыметнікі:* а) беленькі; б) белы: в) бель; г) бяліць; д) бялюткі.

*2.Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:* а) вузкі калідор; б) летні дзень; в) нарачанскі край; г) пясчаная дарога; д) сестрына хата.

*3.Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнікі маюць якаснае значэнне:* а) вішнёвы садок; б) вішнёвыя вочы; в) сонечная ўсмешка; г) сонечны прамень; д) сонечны гадзіннік.

*4.Адзначце формы найвышэйшай ступені параўнання:* а) больш яркі; б) лепшы; в) найменш зручны; г) найпрыгажэйшы; д) самы меншы.

*5.Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы параўнання:* а) гняды; б) добры; в) зялёны; г)малады; д) сляпы.

*6.Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні форм ступеней параўнання:* а) Два гады працы ў экспедыцыі былі для Міколы самай найбольшай радасцю; б) Ад лесу трава была гусцейшая і большая; в) Летась быў высокі ўраджай жыта, а сёлета яшчэ больш вышэйшы; г) Вечар чуткі, гутарлівы разносіць гоман, смех самы найшчаслівейшы; д) Ноч найсвятлейшая, месячная.

*7.Дапішыце канчаткі назоўнікаў і прыметнікаў:* а) на шырок__ дароз__; б) з вясёл__ смех__; в) з-пад жоўт__ лісц__; г) з стар__ дрэв__; д) каля садов__ лаўк__.

*8.Утварыце ад назоўнікаў, што ў дужках, прыметнікі, каб атрымаліся словазлучэнні:* а) (ластаўка) __________________ гняздо; б) (бабуля) ____________________ хваляванні; в) (Міхась) _____________ прыгоды; г) (мама) ________________ характар; д) (цётка) _____________________ парада.

*9.Адзначце прыметнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:* а) барадаты; б) каляземны; в) міжраённы; г) падводны; д) цеплатрывалы.

*10.Падкрэсліце тыя літары, якія трэба пісаць у наступных словах:* а) кіргі(зс/с)кі; б) ліпе(нь/н)скі; в) сакаві(кс/ц)кі; г) слаўгара(дс/ц)кі; д) латы(шс/с)кі.

*11.Адзначце словы, якія пішуцца з адной літарай **н**:* а) вогне_ы; б) палымя_ы; в) племя_ы; г) сярэбра_ы; д) тума_ы.

*12.Адзначце прыметнікі, якія пішуцца разам:* а) горка_салёны; б) Паўднёва_Афрыканскі; в) светла_блакітны; г) ціха_плынны; д) шахматна_шашачны.

*13.Адзначце словазлучэнні. у якіх **не (ня)** пішуцца з прыметнікамі разам:* а) далёка (не, ня)ветлівы; б) (не)высокі ўраджай; в) (не)пахісны змагар; г) (не, ня)лёгкая дарога; д) сонечны, але (не, ня)яркі дзень.

*14.Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць сінтаксічную ролю выказніка:* а) Асенняя туманная раніца заўсёды агортвала Веру шчымлівай тугой па далёкім дзяцінстве, па цеплыні бацькоўскай хаты і матчынай ласцы; б) Усхліпваюць у чаротах неспакойныя хвалі Прыпяці; в) Вакол пануе непарушны спакой восеньскай ночы; г) Дом быў невялікі, але акуратна дагледжаны; д) У абодвух словах мяккі знак не патрэбны.

***Прыметнік*** *(праверачная работа, 6 клас)* II варыянт

*1.Адзначце прыметнікі:* а) блакітны; б) крык: в) крыклівы; г) сінець; д) сіні.

*2.Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:* а) гарачы дзень; б) жоўты лісток; в) залаты пярсцёнак; г) ластаўчына гняздо; д) салодкі мёд.

*3.Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнікі маюць прыналежнае значэнне:* а) курыны грэбень; б) курыны почырк; в) лісіная шуба; г) лісіная нара; д) ліслівая ўсмешка.

*4.Адзначце формы вышэйшай ступені параўнання:* а) багацейшы; б) даражэйшы; в) наймацнейшы; г) прасцейшы; д) самы важны.

*5.Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы параўнання:* а) босы; б) вялікі; в) глухі; г) дрэнны; д) чорны.

*6.Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні форм ступеней параўнання:* а) Паклон табе самы нізкі, мой край залацістых бароў; б) Алеся хоць і самая маладзейшая, але ведала ўсе Лізавеціны песні; в) На свеце няма больш даражэйшых дарог, чым дарога да роднага дому; г) Нясвіж – адзін з самых старажытных культурных цэнтраў Беларусі; д) Дарога дадому заўсёды карацейшая, чым з дому.

*7.Дапішыце канчаткі назоўнікаў і прыметнікаў:* а) з чацвёрт__ клас__; б) ад лев__ бераг__; в) з-за кніжн__ шаф__; г) пад высок__ вярб__; д) для дзіцяч__ садк__.

*8.Утварыце ад назоўнікаў, што ў дужках, прыметнікі, каб атрымаліся словазлучэнні:* а) (брат) __________________ касцюм; б) (Зося) ____________________ кніга; в) (дзед) ______________ паліто; г) (Міколка) ________________ партфель; д) (сарока) _____________________ пяро.

*9.Адзначце прыметнікі, утвораныя спосабам складання:* а) асенне-зімовы; б) запалярны; в) легендарны; г) марозаўстойлівы; д) міжарабскі.

*10.Падкрэсліце тыя літары, якія трэба пісаць у наступных словах:* а) уша(чс/ц)кі; б) восе(нь/н)скі; в) рыба(кс/ц)кі; г) таджы(кс/ц)кі; д) тавары(шс/с)кі.

*11.Адзначце словы, якія пішуцца з адной літарай* ***н:*** а) алавя_ы; б) даўжэ_ы; в) каме_ы; г) салаўі_ы; д) страмя_ы.

*12.Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:* а) беларуска_ўкраінскі; б) Буда_Кашалёўскі; в) Нава_полацкі; г) права_бярэжны; д) паўднёва_заходні.

*13.Адзначце словазлучэнні. у якіх* ***не (ня)*** *пішуцца з прыметнікамі разам:* а) зусім (не, ня)далёкая дарога; б) (не)абсяжны простор; в) (не)чуваны поспех; г) (не, ня)лёгкая, а складаная задача; д) (не, ня)сцерпная гарачыня.

*14.Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць сінтаксічную ролю выказніка:* а) Даль імглістa, нерухома – не відна нічога; б) І ўсё мілагучна для слыху майго; в) Алімпійскія гульні – гэта спартыўнае спаборніцтва мацнейшых; г) А дзявочу красу, нібы тую расу, піў цагляны падвал цёмнай ночы; д) Беларусь! Як ты дорага мне, як нішто і ніколі ў жыцці.